Итак, межжанровый синтез обеспечивает высокую актуальность современного хореографического искусства, поскольку он коррелирует с глобальными социальными и культурными процессами. Созданные в результате межжанрового синтеза хореографические произведения более полно и объективно передают современную сложнейшую художественную картину мира, однако зачастую межжанровый синтез подменяется эклектикой, что в известной степени дезориентирует зрителя и тормозит развитие хореографии как вида искусства.

1. *Бурлина, Е.* Жанрообразование в искусстве как социокультурное явление: Автореф. дисс. … канд. философских наук. – М. : Институт философии АН СССР, 1989. – 49 с.

2. *Лотман, Ю. М.* Семиосфера / Ю. М. Лотман. – СПб. : «Искусство-СПБ», 2000. – 704 с.

3. *Савчук, В.* Конверсия искусства / В. Савчук. – СПб. : Петрополис, 2001. – 288 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***В. А. Касап,***
*кандыдат педагагічных навук,*
*дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі ІДК*

## КААРДЫНАЦЫЯ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК ВНУ І ГАЛІНОВЫХ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ БІБЛІЯТЭК ПА ЗАБЕСПЯЧЭННІ СІСТЭМЫ БЕСПЕРАПЫННАЙ АДУКАЦЫІ

Многія бібліятэкі свету, у тым ліку спецыяльныя галіновыя і бібліятэкі ВНУ, сёння працуюць у складзе аб'яднанняў рознага ўзроўню па стварэнні і давядзенні да карыстальнікаў інфармацыйных рэсурсаў. У навуковай літаратуры шмат апублікаваных работ па бібліятэчным узаемадзеянні для фарміравання інфармацыйных рэсурсаў, абслугоўвання чытачоў, у тым ліку па стварэнні карпаратыўных аб'яднанняў [1; 2; 5; 6]. Аднак адзінай распрацаванай тэорыі і тэхналагічнага забеспячэння ўзаемадзеяння бібліятэк пры стварэнні інфармацыйных рэсурсаў, ажыццяўленні доступу да іх бібліятэкамі розных ведамстваў не існуе. У Рэспубліцы Беларусь было прынята палажэнне «Аб інфармацыйным узаемадзеянні» [3], у якім закладзены асновы каардынацыі бібліятэк у сучасных умовах, адзначаны

кірункі інфармацыйнага ўзаемадзеяння. Сумесная дзейнасць бібліятэк ажыццяўляецца традыцыйна пры фарміраванні фондаў, абслугоўванні чытачоў, падрыхтоўцы інфармацыйнай прадукцыі. Аднак, як адзначае Т. С. Юхнавец [6], каардынацыя дзейнасці спецыяльных галіновых бібліятэк і бібліятэк ВНУ пры фарміраванні фондаў навукова-тэхнічнай літаратуры ажыццяўляецца хаатычна, без неабходнага ўзаемадзеяння.

Актуальнымі кірункамі ўзаемадзеяння бібліятэк на сучасным этапе іх развіцця з'яўляюцца стварэнне і сумеснае выкарыстанне карпаратыўных бібліяграфічных рэсурсаў – зводных каталогаў; стварэнне сістэм карпаратыўнай каталагізацыі; карпаратыўнае абслугоўванне паўнатэкставымі рэсурсамі на падставе міжбібліятэчнага абанемента (МБА), электроннай дастаўкі дакументаў; карпаратыўнае камплектаванне бібліяграфічнымі і паўнатэкставымі рэсурсамі; карпаратыўнае даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне аддаленых карыстальнікаў (віртуальныя даведачныя службы). Разам з тым, бібліятэкі ВНУ навукова-тэхнічнага профілю, а таксама спецыяльныя галіновыя бібліятэкі паспяхова ўзаемадзейнічаюць з бібліятэкамі іншых краін пры рэалізацыі розных праектаў. Як правіла, гэтая праца праводзіцца ў межах кансорцыумаў, якія ствараюцца з мэтай каардынацыі дзейнасці і дасягнення пэўных задач, рэалізацыі розных праектаў.

Перавагамі кансорцыумаў з'яўляюцца адсутнасць аплаты за ўваход да выкарыстання адзіных інфармацыйных рэсурсаў, эканамічная выгада ад аб'яднання інфармацыйных рэсурсаў і абмену імі, паляпшэнне прафесійнай камунікацыі, павышэнне кваліфікацыі бібліятэкараў пры ўкараненні сучасных інфармацыйных тэхналогій. Прыкладамі кансорцыумаў з'яўляюцца: аўтаматызаваная сістэма (АС) Зводнага каталога навукова-тэхнічнай літаратуры (Расія), у рабоце якога прымаюць удзел 7 галіновых рэспубліканскіх і бібліятэк устаноў вышэйшай адукацыі Беларусі; Міжнародная інфармацыйная сістэма па сельскагаспадарчай навуцы і тэхналогіях FAO, членам якой з'яўляецца Беларуская сельскагаспадарчая бібліятэка; кансорцыум МАРС па аналітычным распісванні артыкулаў з перыядычных выданняў, куды ўваходзяць 15 бібліятэк ВНУ нашай краіны. Прыкладам сумеснага стварэння і выкарыстання бібліяграфічных рэсурсаў аб нарматыўна-тэхнічных дакументах нацыянальных інфармацыйных цэнтраў у гэтай сферы

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

з'яўляецца міжнародны праект «PERINORM», удзел у дзейнасці якога прымае Беларускі дзяржаўны інстытут стандартызацыі і сертыфікацыі ды шмат іншых. У Расіі актыўна дзейнічаюць 14 кансорцыумаў, якія аб'ядноўваюць звыш 200 бібліятэк рознага ведамаснага падпарадкавання. Агульная колькасць даступных дакументаў праз адзіны зводны каталог дасягнула звыш 3 мільёнаў запісаў. Сучаснай тэндэнцыяй з'яўляецца аб'яднанне ўсіх кансорцыумаў для пашыранага доступу да размеркаванага рэсурсу. Над гэтай задачай актыўна працуе Асацыяцыя рэгіянальных бібліятэчных кансорцыумаў (АРБІКОН). У дадзенае аб'яднанне ўваходзяць бібліятэкі рознага ведамаснага падпарадкавання, выкарыстоўваецца прынцып размеркаванага захавання розных па відах і зготванні інфармацыйных рэсурсаў, бясспрэчным з'яўляецца выкананне патрабаванняў аўтарскага права на поўныя тэксты і метаданыя. Карыстальнік мае магчымасць звароту да карпаратыўных рэсурсаў праз адзіную кропку доступу.

Мэтай сумеснай дзейнасці большасці кансорцыумаў у сітуацыі, з аднаго боку, недахопу інфармацыйных рэсурсаў і, з другога, немагчымасці іх асвоіць і перапрацаваць самастойна з'яўляецца сумеснае стварэнне і размеркаванае выкарыстанне сумеснага інфармацыйнага прадукту. Як адзначае А. Племнек [4], агульная інфармацыйна-бібліятэчная прастора, у межах якой функцыянуюць кансорцыумы, з'яўляецца шматўзроўневай, іерархічнай і размеркаванай.

Паспяховасць такога ўзаемадзеяння заснавана на прынцыпах сацыяльнага партнёрства, дэманапалізацыі інфармацыйных сховішчаў, сеткавым прынцыпе, бесперапыннасці, калектыўнага доступу, самаразвіцця.

У апошнія гады карпаратыўнае ўзаемадзеянне бібліятэк перанесена ў віртуальную прастору. Як адзначаюць аўтары [2; 4], віртуальная карпарацыя – гэта складаная сістэма арганізацыйнага, прававога, тэхналагічнага ўзаемадзеяння бібліятэк з мэтай задавальнення розных інфармацыйных патрэб карыстальнікаў. Характэрнымі асаблівасцямі віртуальнай карпарацыі бібліятэк з'яўляюцца яе стварэнне для выканання пэўнага ўнікальнага, высокатэхналагічнага праекта, тэрытарыяльная размеркаванасць. Прыклады такога ўзаемадзеяння – віртуальная даведачная служба Карпарацыі ўніверсальных навуковых бібліятэк (КАРУНБ, Расія), у дзейнасці якой прымае ўдзел ад-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на беларуская бібліятэка, а таксама аб’яднанне Libkard па аналітычным распісванні артыкулаў, куды ўваходзяць абласныя навуковыя бібліятэкі і бібліятэкі некаторых устаноў адукацыі Беларусі.

Эфектыўнасць карпаратыўнага ўзаемадзеяння бібліятэк розных сістэм будзе залежыць ад развіцця электронных сэрвісаў (размеркаваны пошук, электронная дастаўка дакументаў, электронная форма МБА, каталагізацыя запазычаннем) і інш. Важным з’яўляецца і напаўненне карпаратыўных сістэм адпаведным кантэнтам (медыяданыя, аналітыка, паўнатэкставыя дакументы); неабходна ўключаць у ствараемы карпаратыўны рэсурс і найбольш аператыўныя, але маладаступныя неапублікаваныя і малатыражныя дакументы, матэрыялы канферэнцый. Акрамя традыцыйных дакументаў, для карыстальнікаў розных катэгорый будзе цікавай і інфармацыя аб вэб-рэсурсах, якія стануць аб’ектам каталагізацыі. Магчымае ўключэнне тэматычных падборак, створаных бібліятэкамі па асобных тэмах, якія найбольш папулярныя сярод чытачоў, для пэўных катэгорый карыстальнікаў.

Інтэграванне інфармацыйных рэсурсаў галіновых бібліятэк і бібліятэк устаноў адукацыі ў адзіную сістэму патрабуе вырашэння на тэхналагічным узроўні і шэрагу пытанняў: аб выкарыстанні адзіных стандартаў электроннага ўзаемадзеяння, каардынацыі ў выбары інфармацыйных тэхналогій, стандартаў перадачы даных і інш. Канкурэнтаздольнасць бібліятэчна-інфармацыйнай прасторы канкрэтнай бібліятэкі, сістэмы бібліятэк, магчымасць задаволіць разнастайныя чытацкія запыты, такім чынам, будзе залежаць ад удзелу бібліятэкі ў рэспубліканскім, галіновым ці міжнародным карпаратыўным аб’яднанні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Артемьева, Е. Б.* Развитие межведомственного библиотечного взаимодействия на территории Сибирско-Дальневосточного региона / Е. Б. Артемьева, А. Н. Маслова // Научные и технические библиотеки. – 1999. – № 8. – С. 22–33.

2. *Воройский, Ф. С.* О корпоративных библиотечных системах и перспективах их развития / Ф. С. Воройский // Информационные ресурсы России. – 2001. – № 3(58). – С. 7–10.

3. Концепция информационного взаимодействия библиотек Беларуси. – Минск, 1999. – 16 с.

4. *Племнек, А. И.* Ресурсы и сервисы Российских корпоративных проектов [электронный ресурс] / А. И. Племнек. – Режим доступа:www. unkniga.ru / biblioteki / vuzbiblio.html. – Дата доступа : 12.12.2015.

5. *Разумова, Э. Г.* Корпоративное взаимодействие универсальных научных библиотек в рамках онлайнового СБО / Э. Г. Разумова // Библиотековедение. – 2008. – № 6. – С. 36–40.

6. *Юхновец, Т. С.* Координация в формировании информационных ресурсов / Т. С. Юхновец // Научные и технические библиотеки. – 2003. – № 12 . – С. 57–59.

***І. П. Клімаў,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры беларускай філалогіі*
*і сусветнай літаратуры*

# САКРАЛЬНАЯ І РЭЛІГІЙНАЯ КАМУНІКАЦЫЯ: ДА ПРАБЛЕМЫ РАЗМЕЖАВАННЯ ПАНЯЦЦЯЎ

Шэраг даследчыкаў не адрознівае сакральную камунікацыю ад рэлігійнай [3, с. 224–225; 6, s. 8], але такое адрозненне здаецца неабходным. Хаця рэлігія скіравана на сакральнае і ўзнікае пры ім, сакральнае не тоеснае рэлігіі і адрозніваецца ад яе. Сакральнае – гэта нешта экстрарэальнае, звышнатуральнае, трансцэндэнтнае, анталагічна інакшае, унікальная і неспасцігальная з’ява, а таму індывідуальная (для ўспрымання), тады як рэлігійнае – масавая і нават тыпізаваная / стэрэатыпная з’ява (яна падзяляецца многімі), а таму сацыяльная і культурная (у сэнсе: частка культуры) паводле сваёй сутнасці. Рэлігія – гэта ідэалогія (у выпадку пэўнага вучэння ці дактрыны) або светапогляд (у выпадку звычайнай, штодзённай свядомасці), тады як сакральнае (калі дапускаць яго існаванне, у тым ці іншым выглядзе) – самастойны і самаісны феномен, незалежны ад грамадства і чалавека, яго пачуццяў, поглядаў і практык. Адпаведна, павінны адрознівацца і віды камунікацыі – унутры рэлігіі і пры зносінах з сакральным.

У рэлігійнай камунікацыі вербальныя сродкі (мова) абавязковыя (хаця магчымыя і невербальныя: міміка, жэсты, рухі, рытуалы), ужо хаця б таму, што вернікам трэба кантактаваць паміж сабой і з астатнім светам. Таму асноўны дыяпазон камунікацыі ў рэлігійным жыцці адбываецца праз вербальны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ